ПАПРАЦУЕМ УДАРНА, ПА-КАМСАМОЛЬСКУ

☆ ☆

14 красавіка студэнты нашага універсітэта накіраваліся ў калгасы і саўгасы Мінскага раёна, каб дапамагчы сельскім працаўнікам убраць бульбу.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 32(377) | Субота, 17 кастрычніка 1959 года | Цана 10 кап.

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ—ПЕРШЫЯ ПОСПЕХІ

...Па бульбяному полю павольна рухаецца бульбаўборачны камбайн. За ім застаецца паласа ворыва. Рассыпаліся па полю юнакі і дзяўчаты, спрытна падбіраюць у кошыкі белыя клубні. Сёлета добры ўраджай бульбы, і кошыкі хутка напаўняюцца. Так пачалі працаваць у саўгасе «Волма» студэнты філалагічнага факультэта нашага універсітэта. Трэці курс рускага адзялення і трэці курс беларускага аддзялення заняты на падборцы клубняў пасля бульбаўборачнага камбайна. Студэнты ж другіх курсаў аддзялення журналістыкі і рускай мовы дапамагаюць рабочым саўгаса ўбраць ураджай капусты, буракоў, цыбулі.

В. СЕМЯНЯКА,
член камітэта камсамола.

★

Добра працавалі першы дзень на ўборцы бульбы студэнты 2 курса фізфака. Асабліва вызначаліся Эдуард Фалей, Іра Анасовіч, Іна Ананьева.

П. САЛАЎ, студэнт фізфака.

Упрыгожым зямлю садамі

Алея выпускнікоў

У мінулым годзе выпускнікі біялагічнага факультэта ў Чырвоным урочышчы пасадзілі некалькі дзесяткаў дрэўцаў і назвалі гэты зялёны ансамбль «Алеяй выпускнікоў». Пяцікурснікі гэтага года рашылі прадоўжыць слаўнае пачынанне сваіх папярэднікаў. У бліжэйшы час яны там жа пасадзяць новыя саджанцы.

Зашумяць ліствою дрэвы

Яшчэ зранку парк культуры і адпачынку імя Горкага напоўніўся смехам, жартамі і песнямі. Але юнакі і дзяўчаты на гэты раз прыйшлі сюды не адпачываць. Былі яны апрануты па-рабочаму, і ў руках кожны трымаў рыдлёўку. Гэта студэнты нашага універсітэта арганізавалі нядзельнік па азеляненню горада.

Асабліва арганізавана правялі нядзельнік фізічны факультэт і першы курс хімфака. Дружна працуючы, яны падрыхтавалі ў парку некалькі дзесяткаў траншэй і ямак для саджанцаў. Студэнты гістфака і юрфака працавалі ў парку «40 год Кастрычніка». Прынялі ўдзел у пасадцы новых алей у парку стадыёна «Дынама» студэнты філалагічнага факультэта.

Прыдзе вясна, і зашумяць ліствою маладыя дрэўцы, пасаджаныя нашымі рукамі.

В. КАПЦІЛОВІЧ.

КОРАТКА

⊙ Студэнты фізічнага факультэта падтрымліваюць цесную сувязь з вайсковай часцю. Рыхтуецца сумесны вечар, прысвечаны Дню артылерыі. Для воінаў у хуткім часе будуць прачытаны лекцыі аб штучным спадарожніку Зямлі, аб новабудоўлях Беларусі, лекцыі на антырэлігійныя тэмы.

⊙ Па 24 гадзіны адпрацавалі на будаўніцтве галоўнага корпуса універсітэта студэнты першага курса рускага аддзялення і аддзялення журналістыкі. Сваёй дружнай працай яны многа дапамаглі будаўнікам. Гэты тыдзень на будаўніцтве працуюць першакурснікі беларускага аддзялення.

⊙ Камітэтам камсамола накіраваны новыя групы студэнтаў у сярэднія школы № 4, 24, 54, 12, 42, 21 і 9 для работы ў якасці піянерважатых. Сярод іх многа першакурснікаў.

⊙ На камсамольскім сходзе студэнты фізічнага факультэта рашылі дагнаць па спорту матэматыкаў. Цяпер на фізфаку ўзмацняецца спартыўная работа.

⊙ Нядаўна адбыўся сход удзельнікаў секцыі турызма-альпінізма. На ім былі абмеркаваны вынікі летніх паходаў і намечаны планы на будучае.

І. СТАРАВОЙТАЎ.
Н. ВЕЧАСЛАВІЧ.

Новыя кнігі

Супрацоўнікі кафедры фізічнай геаграфіі В. А. Дзяменцьеў, В. Ф. Якушка, А. Х. Шкляр падрыхтавалі падручнік «Прырода БССР». Кніга друкуецца ва вучэбна-педагагічным выдавецтве БССР. Недалёкі той час, калі яна паявіцца ў кніжных магазінах.

Акрамя таго, шэраг кніг навуковых работнікаў геафака будзе выпушчан выдавецтвам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сярод іх трэба назваць «Гісторыю геаграфіі» В. А. Дзяменцьева і Н. А. Андрушчанкі, «Зборнік практычных задач па картаграфіі» В. Я. Крышчановіча, «Геалагічная будова і вугляноснасць Беларускага Палесся» Д. М. Каруліна, «Нарысы развіцця мануфактурнай прамысловасці» М. Т. Раманоўскага.

У партарганізацыях ідуць справаздачы і выбары

ПЫТАННЯМ ВУЧОБЫ—ГАЛОЎНУЮ ЎВАГУ

У справаздачным дакладзе сакратар партарганізацыі гістарычнага факультэта стараўся ахапіць усе бакі дзейнасці партбюро. Магчыма таму такім важным пытанням, як вучэбная і навукова-даследчая работа ён удзяліў значна менш увагі, чым чакалася. Выступаючы ў спрэчках, камуністы імкнуліся ліквідаваць недахопы даклада, і на сходзе атрымалася дзелавая размова аб ролі і задачах партбюро ў перабудове вучэбнай і навуковай работы.

Дэкан факультэта П. З. Савачкін падрабязна расказаў аб новым у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў. Змяненні ідуць як па лініі паляпшэння кантынгенту прымаемых (на факультэт прымаюцца галоўным чынам асобы, якія маюць вытворчы стаж), так і ў напрамку канкрэтызацыі праграм, набліжэння іх да жыцця, павелічэння вытворчай і вучэбнай практыкі. Новыя вучэбныя планы і праграмы прадугледжваюць, акрамя педагогаў, падрыхтоўку спецыялістаў па архівазнаўству, археалогіі, музеязнаўству і мастацтвазнаўству. Першы і другі курсы перайшлі ўжо на новыя планы.

—Усё гэта,—сказаў П. З. Савачкін,—ставіць сур'ёзныя задачы перад дэканатам, кафедрамі, і партбюро. Мы павінны не толькі даваць будучым спецыялістам максімум ведаў, але і прывучаць іх да самастойнай навукова-даследчай працы. Між тым партбюро ў мінулым годзе недастаткова займалася гэтымі пытаннямі. Яны амаль выпалі са справаздачнага даклада.

Загадчык кафедры гісторыі КПСС Ф. П. Шмыгаў звярнуў увагу партбюро, камуністаў на неабходнасць значнага паляпшэння завочнай і вячэрняй падрыхтоўкі гісторыкаў, спыніўся на недахопах у навуковай рабоце.

—Партбюро,—адзначыў ён,—не задумалася над тым, як лепш арганізаваць дапамогу выкладчыкам факультэта ў напісанні навуковых работ. Многія таварышы працуюць над доктарскімі і кандыдацкімі дысертацыямі, апублікавалі манаграфіі. Калектыў кафедры гісторыі БССР падрыхтаваў да друку падручнік гісторыі БССР для сярэдняй школы. Аднак уся гэтая работа не стала прадметам дзелавога абмеркавання. Да абмеркавання падручніка гісторыі для сярэдняй школы можна было б прыцягнуць студэнтаў, многія з якіх працавалі ў школах, або будуць працаваць у недалёкім будучым.

Ф. П. Шмыгава надтрымалі выкладчыкі Ф. М. Нечай і М. В. Фрыдман, якія прапанавалі шырока абмяркоўваць усе навукова-даследчыя работы, што напісаны выкладчыкамі факультэта, як да іх апублікавання, так і пасля выхаду ў свет. Дацэнт Л. Б. Шнеерсон прысвяціў сваё выступленне неабходнасці больш цеснай кардынацыі работы кафедраў і студэнцкіх грамадскіх арганізацый для паляпшэння вучэбнай, выхаваўчай і навуковай работы. Аб задачах, якія стаяць перад партбюро, гаварыў загадчык кафедры гісторыі БССР Л. С. Абэцэдарскі.

Нажаль, на сходзе выступіла толькі тры студэнты, у той час як студэнты-камуністы складаюць большасць арганізацыі. Гэта гаворыць аб упушчэннях у падрыхтоўцы сходу. У цэлым жа сход прайшоў ажыўлена і прынёс несумненную карысць.

Прынята рэзалюцыя, накіраваная на паляпшэнне работы партбюро. Сакратаром партарганізацыі абран В. Н. Аляксееў

ПЕРАБУДОВА ВЫКЛАДАННЯ І ПРАФСАЮЗЫ

Гэтае пытанне было цэнтральным на адбыўшайся нядаўна прафсаюзнай канферэнцыі работнікаў універсітэта. З дакладам выступіў прарэктар па навуковай рабоце Г. А. Павецьеў. Ён расказаў, што вялікі калектыў універсітэта нястомна працуе над ажыццяўленнем задач, пастаўленых перад ВНУ краіны Законам аб перабудове сістэмы вышэйшай адукацыі. Гэтая работа вядзецца ў двух напрамках. Яна ідзе як па лініі паляпшэння агульнанавуковай падрыхтоўкі, так і па лініі паглыблення спецыяльнай падрыхтоўкі нашых студэнтаў. Зразумела, што гэтыя два напрамкі прадвызначылі істотныя змяненні ў вучэбных планах універсітэта. У распрацоўцы новых вучэбных планаў актыўны ўдзел прынялі нашы вучоныя. Так, па планах, складзеных у нас на біялагічным факультэце, цяпер вядзецца выкладанне на біялагічных факультэтах усіх універсітэтаў. Як станоўчае, трэба адзначыць, што ў планах біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў значна большае месца займаюць такія дысцыпліны, як хімія, фізіка, матэматыка.

Пасля дакладу разгарнуліся спрэчкі. Першым папрасіў слова дацэнт **І. Г. Некрашэвіч.** Ён узняў вельмі важнае пытанне аб працаўладкаванні студэнтаў першых курсаў. Прамоўца адзначыў, што гэтае важнае пытанне ў нас пакуль што пушчана на самацёк, а між іншым прафсаюзная арганізацыя магла б зрабіць тут вельмі многа.

—Мы павінны,—гаворыць далей тав. Некрашэвіч,—прывіваць студэнтам працоўныя навыкі. І тут вялікая роля належыць прафсаюзнай арганізацыі.

Ён прапануе прафсаюзнай арганізацыі распрацаваць планы павышэння кваліфікацыі вучэбна-дапаможнага персаналу, правесці атэстацыю лабарантаў. Аб неабходнасці такіх мерапрыемстваў гаворыць хаця б той факт, што з 48 лабарантаў універсітэта толькі двое маюць вышэйшую адукацыю.

(Працяг на стр. 2)

—ЦУДОЎНА,— ГАВОРАЦЬ ПЕРШАКУРСНІКІ

Корпус гуманітарных факультэтаў запоўнілі студэнты філалагічнага факультэта. Пад гукі вальса плаўна закружыліся пары, навокал усмешкі, жарты. Так праходзіў вечар сустрэчы студэнтаў старшых курсаў з першакурснікамі беларускага аддзялення.

Кароткім уступным словам афіцыйную частку вечара адкрыў сакратар камсамольскай арганізацыі Уладзімір Ганчароў.

Сваім вопытам падзяліліся з першакурснікамі студэнт пятага курса аддзялення журналістыкі Б. Сачанка, студэнт беларускага аддзялення І. Саламевіч, студэнтка Селяновіч. З цікавай прамовай выступіў выпускнік беларускага аддзялення педагог У. Вінаград. Выкладчыца філфака Т. П. Плешчанка дала першакурснікам карысныя парады, як пісаць лекцыі, як рыхтавацца да практычных заняткаў і экзаменаў. Студэнт І-га курса Уладзімір Мархель падзякаваў старшакурснікаў за такі цудоўны вечар і запэўніў іх у тым, што традыцыі беларускага аддзялення будуць захаваны з гонарам.

Пасля выступленняў пачаўся канцэрт мастацкай самадзейнасці студэнтаў філалагічнага факультэта. Асабліва спадабалася прысутным выступленне студэнта першага курса Г. Тумаса, які прачытаў верш М. Джаліля «Любоў і пасмарк». Добра спяваў украінскія народныя песні студэнт Ганчароў, першакурснік А. Шлег выканаў матроскі танец «Яблычка», У. Карызна і У. Верамейчык прачыталі ўласныя вершы.

І. КАПЦІЛОВІЧ,
студэнт І-га курса філфака.

КОРАТКА

⊙ Студэнты геаграфічнага факультэта дзейсна рыхтуюцца да свята 42-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Арганізаваны розныя гурткі мастацкай самадзейнасці. Удзельніца драматычнага калектыву ўніверсітэта студэнтка 4-га курса Руслана Федароўская ўзначаліла работу драматычнага гуртка. Пастаноўкай танцаў кіруе студэнтка 4-га курса Ала Духаніна.

⊙ Выкладчыкі матэматычнага факультэта прымаюць актыўны ўдзел ва ўсесаюзных канферэнцыях. Днямі з Баку вярнуліся супрацоўнікі кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў В. Ф. Ждановіч і Ю. С. Багданаў. Яны прынялі ўдзел у рабоце канферэнцый па функцыянальнаму аналізу. На канфэрэнцыю ў Ленінград выехалі дактары навук В. І. Крылоў і А. Ю. Турэцкі.

⊙ На хімічным факультэце рыхтуецца вечар сустрэчы з былымі выпускнікамі. Ініцыятарамі арганізацыі вечара выступілі групоргі 4-га курса А. Цыбулька і В. Язычэнка. Абрана арганізацыйнае бюро, якое вядзе падрыхтоўку сустрэчы.

ПЕРАБУДОВА ВЫКЛАДАННЯ І ПРАФСАЮЗЫ

(Заканчэнне. Пачатак на стр. 1)

Матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта да гэтага часу перашкаджае паставіць навукова-даследчы працэс на больш высокі ўзровень. Аб гэтым гаварылі **І. Г. Некрашэвіч, Б. Ф. Осіпаў, Л. І. Лабоцкая.** Адзначалася, што адміністрацыйна-гаспадарчая частка слаба вырашае задачы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Заяўкі трэба складаць у адпаведнасці з запатрабаваннямі, абмяркоўваць іх на пасяджэннях кафедраў сумесна з прафсаюзнымі бюро факультэтаў. На біяфаку няма віварыя, пакідае жадаць лепшага абсталяванне іншых лабараторый. У памяшканні ж біястанцыі «Чырвонае ўрочышча» няма нават печак, на 70—80 працэнтаў бракуецца і выкідваецца насенны матэрыял, таму што няма магчымасці арганізаваць сушку. У лабараторыях фізфака, хімфака неабходна ўстанавіць вентылятары.

Пытанне аб вучэбнай нагрузцы выкладчыкаў закрануў **А. С. Федэнка.**

—Хіба можна лічыць нармальным,—адзначыў ён,—што ў нас на матэматычным факультэце на кожнага выкладчыка прыпадае па 700—1000 лекцыйных гадзін. Зразумела, што пры такіх умовах зусім мала часу застаецца для навуковай работы.

—Больш чым выкладчыкі,—сказаў асістэнт фізфака **А. А. Лабуда,**—бадай што, перагружаны ў нас лабаранты. Некаторым з іх прыходзіцца працаваць па 14—16 гадзін. Чаму так атрымліваецца? Аб'ём работы ўвесь час расце, а штат застаецца ранейшым. Такое становішча трэба змяніць.

Аб рабоце выдавецтва гаварылі **А. С. Федэнка** і **А. А. Волк.** Адзначалася, што ў сувязі са скарачэннямі лекцыйных курсаў востра паспявае неабходнасць напісання кафедрамі вучэбных дапаможнікаў.

—Ёсць у нашай работе,—сказаў **І. А. Карабань,**—адзін вельмі істотны недахоп. Я маю на ўвазе педпрактыку. Праходзіць яна нездавальняюча. Асабліва на 5-м курсе, так званая выхаваўчая практыка. Да гэтага часу няма школ, з якімі б мы былі пастаянна звязаны. Да педпрактыкі не прыцягваюцца лепшыя выкладчыкі.

Дацэнт **В. Ф. Чыгір** і многія іншыя ў сваіх прамовах закраналі жыллёва-бытавыя ўмовы выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Прафсаюзная арганізацыя, гаварылі яны, павінна зрабіць усё, каб палепшыць іх.

Прафсаюзная канферэнцыя абрала таксама склад таварыскага суда. У яго ўвайшлі І. С. Цішкевіч, І. І. Марцінкевіч, У. Л. Корхаў, Д. А. Балабаеў, Ф. Г. Асіпенка, М. П. Баранава, М. Е. Маркевіч.

У рабоце канферэнцыі прыняў удзел старшыня рэспубліканскага Савета прафсаюзаў работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў **С. П. Ляснічы.**

Пачатак ёсць

Цікава і змястоўна прайшло першае пасяджэнне гуртка па вывучэнню рускай класічнай літаратуры. Кіраўнік З. С. Мелкіх азнаёміла прысутных з планамі гуртка. Тэматыка ў гэтым годзе вельмі рознастайная. Яна закранае творчасць Талстога, Буніна, Тургенева, Фета і іншых. У сувязі з прадстаячым юбілеем вялікае месца зойме даследаванне творчасці А. П. Чэхава.

Акрамя таго, на працягу года будуць абмяркоўвацца праблемныя артыкулы часопіса «Пытанні літаратуры».

З паведамленнем аб працы над тэмай «Чэхаў і Кэтрын Мэнсфілд» выступіла студэнтка 5-га курса Ліля Захватава.

В. БРЭСКАЯ,
староста гуртка.

Вершы Віктара Куневіча

☆

Брестская крепость

Теснее сжимается вражье кольцо
И ходит земля под ногами.
В бессмертье вступает боец за бойцом,
Над крепостью знамя, как пламя.
Штыком на стене перед смертью герой
Чертит в подземелии мглистом:
«Я долг перед Родиной выполнил свой,
Считайте меня коммунистом...».
Последняя пуля, последний патрон,
Но будет победа за нами!
Тридцатые сутки стоит гарнизон,
Над крепостью пламя, как знамя.

Тюрингские сосны

Тюрингские сосны шумят в перелесках
По склонам темнеющих гор.
И чудится мне: на холмах у Смоленска
Вздыхает задумчивый бор.
Куда за грибами вихрастым мальчишкой
С кошелкой бежал по утрам,
Где ранней весною с потрёпанной книжкой
Встречал ледоходы Днепра.
Сажал у дороги рябины и клёны
И пил я берёзовый сок.
И только девчонке под вербой зелёной
В любви об'ясниться не смог.
Тюрингские сосны шумят надо мною,
В палатках товарищи спят,
А я с автоматом и скаткой тугою
Тропою шагаю в наряд.

ГЁТЕ

Старый замок неприветлив, сер.
Эльба по затокам тихо плещет.
Автострада у горы, как серп,
На асфальте паутина трещин.
У обочины сосна шумит,
Шишки растопыренные в хвое.
Встал великий Гёте на гранит
И восход приветствует рукою.

ЛУНА

Застыли облаков седых отроги,
Из-за холма луна в безмолвьи
На братскую могилу у дороги
Глядит, наплакавшись по-вдовьи.
Мерещится, бессонными ночами,
Склоняясь над могилой низко,
Она целует тусклыми лучами
Холодный мрамор обелиска.

Віктар Куневіч нарадзіўся на Смаленшчыне ў 1934 годзе. Закончыў два ваенныя вучылішчы, служыў у радах Савецкай Арміі за рубяжом. Пасля дэмабілізацыі працаваў старшым механікам у дарожнай арганізацыі на Смаленшчыне.

У 1957 годзе паступіў на першы курс аддзялення журналістыкі нашага універсітэта. Вершы В. Куневіча друкаваліся ў газетах «Во славу Родины», «Советская Армия», «Рабочий путь», «Смена», «Чырвоная змена», «Знамя юности», «Казахская правда», часопісе «Советская Отчизна», і інш.

Паэт падрыхтаваў да друку зборнік «Плачут берёзы», які выйдзе ў Смаленскім выдавецтве.

Сёння мы друкуем нізку новых вершаў Віктара Куневіча.

☆

СТЕНА

Холмы раскинув в изголовьи,
Глядит бойницами стена.
И знает только Приднепровье,
Как много видела она.

Ещё мальчишкой деревенским,
Я к ней взбирался на плечо.
Стена была замком смоленским,
А был Смоленск к Москве ключом.

Лежит подковою у склонов,
Как память славной старины,
Здесь сбили спесь Наполеону
«России верные сыны».

И у стены уланов польских
Встречали шеинцы в штыки,
Здесь в 41 у Никольских
Дрались стрелковые полки.

По ней, где травы в щелях виснут,
Осколков росчерки видны,—
Как по странице летописной
Прочтешь историю страны.

ЛЕДЯНАЯ АВТОСТРАДА

Ползут и кружатся по насту
Позёмки длинные хвосты.
Степь замело, дороге—баста,
Нельзя проехать и версты.

Стал ледяною автострадой
Капризный старожил Ишим.
И регулирует, что надо,
Мороз движение машин.

Встают сугробы на прибрежьи,
У круч высоких снег пушит.
Взвалив на плечи, грузы держит
С кряхтеньем труженик Ишим.

ФЕЛЬЕТОН

Патрэбна яшчэ апошняе сказанне...

ЖЫЦЦЁАПІСАННЕ. РАДАСЦІ І НЯГОДЫ СТУДЭНТА М. ЖУКА

★ ★

Гэта быў агульны сшытак у каленкоравай вокладцы. Сіратліва ляжаў ён у калідоры інтэрната, што на Свярдлова. Інтрыгуючы загаловак на першай старонцы прыцягнуў увагу першакурснікаў—гісторыкаў. Яны беражліва паднялі гістарычны сшытак і даставілі нам у рэдакцыю. Вось што там было напісана:

«3 красавіка. Што за цудоўны сёння дзень! Пяшчотна свеціць сонейка, снегу ў горадзе няма і ў паміне. На дрэвах набухлі пупышкі, так і глядзі—выкінуць кволую маладую зеляніну. Як хораша на вуліцах! Нават спаць не хочацца. Дальбог жа ахвотна падзяжурыў бы, але на носе экзамены. А сон—залог здароўя і поспехаў.

15 красавіка: Учора выклікалі на пасяджэнне студсавета. Укацілі строгую вымову з папярэджаннем. Дзякуй Раісе Барысаўне Паінай—выступіла ў маю абарону, а то хацелі сухія душы выселіць з інтэрната. А за што? Убачылі віну ў тым, што ў начное дзяжурства пайшоў спаць у пакой, пакінуўшы адчыненнымі ўваходныя дзверы. Вясна ж на дварэ; не разумеюць людзі, што цяпер ніхто ўжо не прастыне.

20 верасня. Ух, быццам гара з плеч звалілася—вызвалілі ад абавязкаў групорга камсамольскай групы трэцяга курса беларускага аддзялення. Ліха з ім, што склянялі на сходзе. Затое цяпер ніякіх нагрузак. Прызнацца, абрыдла ўжо быць выхавацелем моладзі. Не маё гэта амплуа.

27 верасня. Праўду кажуць, што радасць ходзіць побач з горам. Не паспеў як след адсвяткаваць сваё вызваленне, як звалілася бяда. Высяляюць з інтэрната. З-за дробязі прыдраліся. Падумаеш, пабіўся!.. Як ні тлумачыў членам студсавета, што гэта была не бойка, а сяброўская праверка моцнасці сківіц—не дапамагло. Прычына спрэчкі нязначная, не буду пісаць аб ёй. Хто захоча даведацца, няхай звяртаецца да майго партнёра, студэнта другога курса гістарычнага факультэта Мікалая Клімовіча. Ён расказваў аб ёй на пасяджэнні студсавета. Хапіла ў хлопца розуму! Я ж чалавек культурны, прамаўчу. Ды і сорамна прызнацца, што пабіліся ў... туалеце! Падвяла мяне «зладзейка з наклейкай». Колькі разоў кляўся сам сабе, што не буду піць! І Клімовіч добрая цаца! Навошта спатрэбілася яму шукаць мяне да чатырох гадзін ночы? Быў п'яны ў сцельку, інакш здагадаўся б зазірнуць у кнігу. А там чорным па беламу напісана прозвішча, пастаўлен нумар пакоя. А то паплёўся па ўсяму інтэрнату, урываўся ноччу ў пакоі, галёкаў—мяне шукаў. Гм, дзівак. Наогул, бойка нязначная. Горш іншае. Намеснік дэкана Р. В. Булацкі наклаў рэзалюцыю аб высяленні мяне з інтэрната. А Клімовічу зноў пашанцавала. Дэкан гістарычнага факультэта П. З. Савачкін, кажуць, найдабрэйшай душы чалавек, нікога не пакрыўдзіць. Увесь універсітэт ведае аб бойцы, рэктарат ведае, а дэкан не ведае. А можа і ведае, але... не дае рэзалюцыі аб высяленні. Ды і хлопцы на другім гістфака, відаць, што трэба. Не выдалі Клімовіча. А нашы? Эх, што і казаць... Пашанцавала хлопцу.

9 кастрычніка. Афіцыяльна з'явіўся да мяне ў пакой старшыня студсавета Я. Шарамецьеў, прачытаў загад за № 303 ад 6 кастрычніка, папярэдзіў, каб праз тры дні пакінуў інтэрнат. Пярэчыць дарэмна—ніхто не заступіцца.

А Клімовіч па-ранейшаму гогалем ходзіць. Я нават радуюся крыху:

— Не хапіла паўнамоцтваў у студсавета выселіць Клімовіча без рэзалюцыі дэкана...»

На гэтым жыццёапісанне радасцей і смуткаў студэнта філфака Міхаіла Жука абрываецца.

Цікава, хто дапіша яго апошнія радкі.

А. НАЗЯВІН,
студэнт II курса аддзялення журналістыкі.

СТУДЭНТЫ-ЭКСКУРСАВОДЫ

Штогод заалагічны музей універсітэта наведваюць сотні экскурсантаў. Але часцей усіх бываюць у нас школьнікі Мінска.

Вялікую дапамогу у правядзенні школьных экскурсій аказваюць студэнты біялагічнага факультэта. Для гэтага будучыя экскурсаводы старанна вывучаюць музей, дэталёва знаёмяцца з рознымі экспанатамі. Акрамя вучэбнай літаратуры яны чытаюць дадатковую. Так днямі школьнікаў пазнаёмілі з музеем студэнткі пятага курса біяфака Лебедзева і Каралава. Яны старанна рыхтаваліся да экскурсіі, чыталі многа заалагічнай літаратуры, вывучалі экспанаты музея, і ў выніку змаглі цікава расказаць аб іх вучням.

Аднак не ўсе студэнты біяфака ўключыліся ў экскурсійную работу і не атрымліваюць у гэтай справе пэўных навыкаў. Між тым гэта вельмі важна і карысна не толькі ў сэнсе аказання дапамогі школам, але і ў падрыхтоўцы самі студэнтаў як будучых педагогаў і прапагандыстаў прыродазнаўства.

Для вядзення агляднай экскурсіі супрацоўнікамі музея напісан прыкладны кароткі тэкст тлумачэнняў па матэрыялах музея, аднак гэты тэкст не размножаны. Было б пажадана, каб вучэбная частка універсітэта дапамагла надрукаваць гэты тэкст невялікім тыражом.

Ф. ВАРОНІН, загадчык заалагічнага музея.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦ

АТ 10807. Зак. 1548. Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.